УДК 7.03(476)

**І. У. Каляда**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ Ў 1920-Я ГГ.: ТРАДЫЦЫІ І ПОШУК НОВЫХ НАПРАМКАЎ

У артыкуле разглядаюцца праблемы станаўлення і развіцця нацыянальнага мастацтва як аднаго з кірункаў палітыкі беларусізацыі, што праводзілася на Беларусі ў 1920-я г. Пачыналі з вывучэння беларускай народнай творчасці, гісторыі беларускага мастацтва, што дапамагло вызначыцца новым кірункам у выяўленчым мастацтве, наладзіць рэгулярную выставачную дзейнасць, арганізаваць работу мастацкіх таварыстваў. У залежнасці ад творчых памкненняў мастакі аб'ядноўваліся ў творчыя групоўкі. Ішла актыўная барацьба новага са старым, узнікалі самыя разнастайныя плыні, новыя напрамкі, што садзейнічала стварэнню нацыянальнай мастацкай школы.

**Ключавыя словы:** выяўленчае мастацтва, творчыя пошукі, беларусізацыя, выстава, беларуская культура, творчасць, графіка, скульптура, жывапіс, таварыства.

**I. U. Kalyada**
Belarusian State Technological University

# ART OF BELARUS IN THE 1920s: TRADITIONS AND THE SEARCH FOR NEW DIRECTIONS

The article deals with the problems of formation and development of national art as one of the areas Belarusization policy conducted in Belarus in 1920. We began with a study of the Belarusian folklore, Belarusian art history that has helped to define a new direction in the visual arts, to establish a regular exhibition activity, organize the work of art societies. Depending on the creative aspirations of artists united in creative group. Was an active struggle of the new with the old, there were a variety of trends, new directions, which contributed to the creation of a national art school.

**Key words:** fine art, creative pursuits, belorussizatsiya, an exhibition of Belarusian culture, creativity, drawing, sculpture, painting, society.

**Уводзіны.** 1920-я гг. ў гісторыю Беларусі ўвайшлі як перыяд адраджэння, росквіту беларускай культуры. У рэчышчы палітыкі беларусізацыі, якая ахапіла ўсё жыццё, у тым ліку адбывалася станаўленне і развіццё нацыянальнага мастацтва, назіралася імкненне да стварэння нацыянальнай мастацкай школы, да нацыянальнай своеасаблівасці ў мастацтве.

1920-я гг. характарызаваліся творчымі пошукамі новых напрамкаў, найбольш выразных мастацкіх формаў у выяўленчым мастацтве. Адзначым, што калі новая беларуская літаратура магла абаперціся на родную мову, на вопыт сваіх папярэднікаў (В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча) і імёны ўжо шырока вядомых майстроў слова (Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча), то новае беларускае мастацтва такой апоры не мела. Мастацкая школа ў Вільні спыніла сваё існаванне яшчэ ў 1832 г. Мастакі, якія працавалі на Беларусі ў 1920-я гг. (Грубэ А., Дучыц М., Касцялянскі А., Мільчын І.), мала што ведалі пра беларускія мастацкія традыцыі і сваіх папярэднікаў.

**Асноўная частка.** Пачыналі з таго, што яшчэ ў 1921 г. пры Беларускім аддзеле Наркамасветы БССР была заснавана Экспедыцыя па вывучэнню беларускай народнай творчасці з мэтай «всестороннего изучения и разработки народного художественного творчества Беларуси как основного начала для возрождения белорусского национального искусства» [1, л. 7].

Работа Экспедыцыі падзялялася на два сектары – збіральны і мастацка-навукова-вытворчы, таму ў склад яе ўваходзілі мастакі-спецыялісты, якія мелі вопыт у той ці іншай галіне. Задачай другога сектара было ўтварэнне мастацкіх школ і адкрыццё шэрагу мастацка-вытворчых майстэрняў. У выніку былі сфармаваны кадры спецыялістаў-інструктараў, якія дапамагалі падтрымліваць і развіваць мастацкія здольнасці мясцовых саматужнікаў.

Паступова Экспедыцыя ўцягнула ў сферу сваёй дзейнасці самыя аддаленыя куткі, пранікла ўглыб народных мас, паўсюды ўносіла элементы народнага мастацтва і ўздымала ўзровень культурнай свядомасці.

Вывучэнне гісторыі беларускага мастацтва пачалося па ініцыятыве выдатных беларускіх мастацтвазнаўцаў Шчакаціхіна М. і Каспяровіча М. Першы арганізаваў пры БДУ кафедру гісторыі беларускага мастацтва і ўзначаліў працу Камісіі гісторыі мастацтва секцыі беларускага

мастацтва пры Інстытуце беларускай культуры. Менавіта ён паставіў пытанне аб фармаванні новага нацыянальнага беларускага мастацтва, шляхамі да якога лічыў неабходнасць пазнання і вывучэння народных вытокаў, перадачу ў пластычных вобразах гістарычнага, псіхалагічнага, жыццёва-бытавога вобраза народа [2, с. 12–13].

М. Касяровіч, які займаўся даследаваннем гісторыі беларускага выяўленчага мастацтва, архітэктуры, графікі, наладзіў вывучэнне гісторыі беларускага мастацтва пры Віцебскім мастацкім тэхнікуме і шмат зрабіў для папулярызацыі здабыткаў вывучэння мастацкага мінулага Беларусі [3].

Пазнанне мінулага дапамагала вызначыцца новым накірункам у выяўленчым мастацтве, такім як рэалістычны (В. Волкаў, М. Дучыц), імпрэсіяністкі (У. Кудрэвіч), неарэалістычны, які ішоў шляхамі заходнееўрапейскага мастацтва (І. Ахрэмчык), дэкаратыўнае мастацтва (А. Марыкс).

У 1921 г. у Мінску па ініцыятыве мясцовых мастакоў была арганізавана выстава, якая стала своеасаблівым аглядам мастацкіх сіл, выявіла ўсе накірункі і тэндэнцыі, якія існавалі ў той час у мастацтве.

У пачатку 1920-х гг. цэнтрам беларускай выяўленчай школы стаў Віцебск, дзе па ініцыятыве М. Шагала яшчэ ў 1919 г. была арганізавана Народная мастацкая школа «новага рэвалюцыйнага ўзору», задача якой – «проводить в жизнь начала подлинно революционного искусства, порывающего со старой академической рутиной» [1, л. 14]. Вучэбны працэс азначаўся шматвектарнасцю – тут працавалі рэалісты, кубісты, экспрэсіяністы і авангардысты.

На нейкі час школа становіцца месцам актыўнага фармавання новых мастацкіх плыняў, адметнай рысай якіх стала пачуццё асобага аптымізму, што было вызвана кардынальнымі пераменамі ў грамадскім жыцці. У якасці вядучых выкладчыкаў працавалі Дабужынскі К., Пэн Ю., Малевіч К., Фальк Р. і інш.

У канцы 1919-га – пачатку 1920-га з мэтай «абнавіць мастацтва, замяніўшы яго абстрактнымі формамі», вакол заснавальніка супрэматызму Малевіча К. у Віцебску ўтвараецца авангардысцкая арганізацыя «Сцвярджальнікі новага мастацтва» (УНОВИС) (К. Малевіч, М. Шагал, Л. Лісіцкі, У. Стрэмінскі). Члены гэтай арганізацыі былі ўпэўнены, што новы свет, які будуецца ў выніку рэвалюцыі, павінен выпрацаваць і новыя формы, і ўслед за К. Малевічам пачалі ствараць самыя разнастайныя камбінацыі з геаметрычных фігур [4, с. 291–292]. У выніку была распрацавана такая мова мастацтва, якая адкрыла шлях да прамысловага дызайну, мастацкага канструявання. Адзначым, што ідэі віцебскіх авангардыстаў вызначылі ў далейшым многія знаходкі і дасягненні сусветнай архітэктуры дызайну, кніжнай і прамысловай графікі.

У сярэдзіне 1920-х гг. на базе мастацкай школы быў утвораны Віцебскі мастацкі тэхнікум (які ў далейшым атрымае статус інстытута). Педагагічны састаў змяняецца мастакамі-рэалістамі – Керзін М., Волкаў В., Фогт Ф., Ахрэмчык І., Дзежыц В., Дакальская Г. і іншыя, якія палажылі пачатак нацыянальнай рэалістычнай школы.

У гэты перыяд асаблівага росквіту дасягнула графіка, якая вызначалася дэмакратычнасцю, імкненнем да стварэння нацыянальных вобразаў. Яна была прадстаўлена станкавымі творамі, кніжнай ілюстрацыяй, плакатамі, сатырычнымі малюнкамі ( К. Каганец, Я. Драздовіч, А. Каменскі).

Значны ўклад у развіццё даваеннай станкавай графікі ўнёс А. Астаповіч, які ў сваёй творчасці ў большасці звяртаўся да вясковых пейзажаў, што былі адзначаны тонкім пачуццём беларускай прыроды («Ранішняя вясна», «Сакавік» (1923), «Зіма» (1927), «Вясенні пейзаж» (1928)). А. Астаповіч – прадстаўнік т. зв. чыста лірычнага пейзажа, пейзажа-настрою. Ім створаны шэраг графічных лістоў, адметнымі рысамі якіх была яркая нацыянальная самабытнасць, нацыянальны каларыт.

Адзін з першых графікаў, цэнтральнай тэмай творчасці якога стала тэма працы, – А. Тычына («На электрастанцыі», «Слясарны цэх», «Маляры»). У 1927 г. аўтар звяртаецца да ксілаграфіі – «Маладзік», «Ускраіна», «Дождж». Большая частка работ будуецца на кантрасце белага і чорнага колераў, як бы падкрэсліваючы рытм чалавечай працы.

Вялікі ўклад у развіццё беларускай станкавай графікі ўнеслі педагогі і выпускнікі Віцебскага мастацкага тэхнікума. У тэхніцы ксілаграфіі шмат працаваў С. Юдовін, які ў 1920-я гг. выканаў серыі «Стары Віцебск» і «Мястэчка».

Пад уплывам графікі С. Юдовіна ў Віцебску развіваецца творчасць Е. Мініна – аднаго з самых здольных, арыгінальных і перспектыўных гравёраў. У 1926–1927 гг. ён стварае свае лепшыя работы – пейзажы Віцебска, жанравыя сцэнкі, партрэты. Мастак шмат увагі надае паказу прыгажосці роднага горада, помнікаў архітэктуры. Прыкладам могуць служыць графічныя лісты – «Іллінская царква ў Віцебску» (1927), «Успенскі сабор у Віцебску» (1927), «Ускраіны Віцебска» (1928), серыя «Беларускае драўлянае дойлідства» (1927).

Паступова цэнтр мастацкага жыцця краіны стаў перамяшчацца ў Мінск, які з адсталага губернскага горада пэтвараўся ў буйны адміністрацыйна-эканамічны і культурны цэнтр.

Тут быў адкрыты Беларускі дзяржаўны універсітэт, пачаў функцыянаваць Інстытут беларускай культуры, паспяхова развіваўся нацыянальны тэатр (БДТ-1), працавалі выдавецтвы, актыўна разгортвалася літаратурнае жыццё.

Рубяжом, з якога пачынаецца прынцыпова новы этап у развіцці выяўленчага мастацтва Беларусі, можна лічыць 1925 г., калі ў Мінску адкрылася першая Усебеларуская мастацкая выстава, якая дапамагла выявіць мастакоў, што працавалі на Беларусі, і пазнаёміла з іх творчасцю працоўных рэспублікі. Таксама свае работы прадставілі мастакі – ўраджэнцы Беларусі, якія пражывалі і працавалі за межамі краіны, прадстаўнікі Асацыяцыі мастакоў рэвалюцыйнай Расіі. Такім чынам, быў пакладзены пачатак актыўнаму супрацоўніцтву мастакоў брацкіх рэспублік.

Першая Усебеларуская мастацкая выстава 1925 г. істотна адрознівалася ад выставы 1921 г. не толькі колькасцю ўдзельнікаў, але і ідэйнай накіраванасцю. Тут ужо вырашалася пытанне аб актыўным удзеле мастакоў у будаўніцтве новага жыцця, аб засваенні савецкай тэматыкі.

Выстава была прымеркавана да 20-й гадавіны рэвалюцыі 1905 г., і большасць экспанаваных твораў прысвячалася гэтай тэме. Сярод іх – работы Ю. Пэна «Пасля забастоўкі 1905 г.», М. Філіповіча «Растрэл у Мінску», В. Волкава «Барыкады. З падзей 1905 г. у Маскве» і інш. Мастакі вырашалі творчыя праблемы па-рознаму. Адны, прытрымліваючыся старога акадэмічнага курса, будавалі кампазіцыі традыцыйна; другія – стваралі работы абстрактнага характару. Былі на гэтай выставе і творы, прысвечаныя тэме працы, і кампазіцыі на гістарычныя тэмы.

Аднак сапраўдны выхад мастацтва на шырокую грамадскую арэну пачаўся трохі пазней, у 1927 г., калі ў Мінску было створана Усебеларускае аб'яднанне мастакоў (праіснавала да 1932 г.). Аб'яднанне ставіла сваёй мэтай згуртаванне выяўленчых сіл Беларусі, распрацоўку развіцця беларускага выяўленчага мастацтва; садзейнічала арганізацыі выстаў, студый і інш. Членамі Мінскага аддзялення былі Грубэ А. (старшыня), Дучыц І., Мрачкоўская П., Астаповіч А., Тычына А. і інш. Акрамя Мінскага, Аб'яднанне мела свае філіялы ў Віцебску, Гомеле, Магілёве, а таксама ў Маскве і Петраградзе.

Менавіта з гэтага часу пачынаецца арганізацыйны перыяд развіцця мастацтва, яго больш актыўная сувязь з грамадкім жыццём, паступовая беларусізацыя зместу і форм.

Мастакі ў залежнасці ад іх творчых памкненняў аб'ядноўваліся ў творчыя групоўкі, удзельнічалі ў выставах. Дарэчы, у краіне была наладжана рэгулярная выставачная дзейнасць: у 1927 г. адбылася другая, а ў 1929 г. – трэцяя Усебеларуская мастацкая выстава. Былі закладзены традыцыі персанальных выстаў.

Другая (1927) і Трэцяя (1929) Усебеларускія мастацкія выставы прайшлі пад знакам збірання творчых сіл і засваення мастакамі сучаснай тэматыкі. Краіна рыхтавалася адзначыць 10-годдзе савецкай улады і 10-ю гадавіну ўтварэння БССР. Побач з мастакамі старэйшага пакалення ўсё большую ролю пачыналі іграць маладыя мастакі. На выставах упершыню выступілі такія мастакі, як Ахрэмчык І., Гусеў Н., Мільчын І. і інш. Аднак, нягледзячы на з'яўленне новых работ, якія адрозніваліся сталасцю мастацкага выканання, агульны прафесійны ўзровень беларускага выяўленчага мастацтва быў яшчэ даволі нізкім.

Аб характары беларускага тэматычнага мастацтва першых гадоў савецкай улады можна меркаваць па тых творах, якія экспанаваліся на першых рэспубліканскіх мастацкіх выставах. Дамінуючае месца ў тэматычнай карціне 1920-х гг. займалі дзве тэмы – тэма рэвалюцыі і грамадзянскай вайны і тэма будаўніцтва беларускай дзяржавы і сацыялістычнага грамадства. Вядучае месца ў творчасці мастакоў заняла гісторыка-рэвалюцыйная тэматыка. У такім жанры, напрыклад, працаваў выпускнік Пецярбургскай акадэміі мастацтваў Волкаў В., які ў 1920-я гг. выкладаў у Віцебскім мастацкім тэхнікуме і лічыўся родапачынальнікам беларускага гістарычнага мастацтва. Мастак напісаў шэраг палотнаў, прысвечаных значным падзеям у жыцці беларускага грамадства («Барыкады», «Партызаны»).

Ва ўсіх жанрах, у тым ліку і ў гістарычным, працаваў М. Філіповіч – адзін з актыўных удзельнікаў першых беларускіх мастацкіх выстаў. Яго творчасць займае асобае месца ў мастацтве Беларусі 1920-х гг. У першыя гады сваёй творчасці ён знаходзіўся пад уплывам розных плыняў, але з цягам часу звярнуўся да адлюстравання ў жывапісу фальклорных тэм, падзей беларускай гісторыі («Народнае гулянне», «На Купалле», «Вясновае свята»).

Пастаянны ўдзельнік выстаў 1920-х гг. – І. Ахрэмчык на Трэцяй Усебеларускай выставе прадставіў палатно «Падпісанне маніфеста аб утварэнні БССР» (1929), за якое атрымаў першую прэмію. Гэтай карцінай мастак паклаў пачатак прафесійнай распрацоўцы гісторыка-рэвалюцыйнай тэмы ў беларускім жывапісу.

Тэма рабочых будняў, жыцця рабочага класа г. Мінска даволі цікава раскрываецца ў творчасці М. Станюты – «Шклозавод» (1924), «Бятоншчыкі» (1927), «Будаўніцтва універсітэцкага гарадка» (1928), «На будоўлі» (1929), «Ліцейный цэх» (1931). Гэта творы, якія нара-

дзіліся ў выніку непасрэднага назірання мастака за жыццём рабочых.

Свой уклад у развіццё беларускага жывапісу 1920–1930-х гг. унёс Я. Драздовіч – таленавіты жывапісец і графік, майстар дэкаратыўнаприкладного мастацтва, этнограф і фальклярыст. Мастацкая спадчына аўтара вельмі разнастайная. Я. Драздовіч піша вобраз першадрукара Скарыны Ф., які па кампазіцыйнаму рашэнню вельмі нагадвае вядомую гравюру Скарыны з Бібліі.

Значнае месца ў творчасці Я. Драздовіча займае пейзаж. Акрамя таго, трэба адзначыць, што ён з'явіўся першаадкрывацелем такой незвычайнай для беларускага выяўленчага мастацтва тэмы, як касмічная («Жыццё на Марсе», «Жыццё на Сатурне», «Жыццё на Луне»).

Другі цікавы творчы пласт Я. Драздовіча – маляваныя дываны, якія прызначаліся для ўпрыгожання вясковых хат. У гэтай галіне выяўленчага мастацтва Я. Драздовіч меў надзвычайны поспех.

У 1928 г. пачало дзейнічаць Беларускае мастацкае таварыства «Прамень», якое было арганізавана тымі мастакамі, якія выйшлі з Усебеларускага аб'яднання мастакоў па прычынах «расхождения в области формальных изысканий, подчинения ВОХ старым традициям дореволюционного периода, отсутствия культработы внутри ассоциации и т. д.» (з Дэкларацыі заснавальнікаў Беларускага мастацкага таварыства «Прамень») [5, л. 29]. «Прамень» быў утвораны з мэтай «самаўдасканалення і… утварэння мастацтва нацыянальнага па форме і пралетарскага па зместу» [5, л. 33]. Таварыства прадстаўлялі А. Вало (старшыня), У. Бохан, У. Кавалёў, В. Мурашоў, В. Ціхановіч і інш.

Дзейнасць аб'яднання была разнастайнай: лабараторныя практычная заняткі, даклады па гісторыі мастацтва, аб беларускім народным мастацтве, публічныя лекцыі, вечары, дыспуты, а таксама падарожжы па БССР і СССР з мэтай знаёмства з мастацкай творчасцю розных народаў.

Прадстаўнікі ўсіх жанраў выяўленчага мастацтва плённа працавалі, асабліва жывапісцы. Ад невялікіх пейзажаў і партрэтаў яны пераходзілі да значных тэм. Усё большае месца ў працы мастакоў займала грамадскае жыццё, гісторыя, побыт народа, прыгажосць беларускай прыроды.

Працяглы шлях развіцця разам з жывапісам прайшла скульптура, важную ролю ў фармаванні якой адыграла стварэнне на базе Віцебскага мастацка-практычнага інстытута ў 1923 г. Дзяржаўнага мастацкага тэхнікума са скульптурным аддзяленнем. Яе дасягненні ўвасоблены ў творчасці А. Грубэ, А. Бразэра, З. Азгура, А. Бембеля, А. Глебава, А. Арлова і інш.

Адным з першых скульптараў, які пакінуў значны след у беларускім мастацтве, быў Грубэ А. Былы студэнт Пецярбургскага ўніверсітэта, а пасля настаўнік у вясковай школе, ён не быў прафесійным мастаком. Аднак з 1922 г., калі ён пераязджае ў Мінск, і да 1941 г. працуе ў калектыве мінскіх мастакоў, з'яўляючыся адным з самых цікавых майстроў у беларускім мастацтве. Мастак звяртаецца да традыцый беларускай народнай разьбы па дрэве. Да лепшых яго работ належыць скульптура «Лірнік» (1925), скульптура-партрэт М. Багдановіча (1926), «Раб» (1927), «Тачачнік» (1926).

Другой адметнай фігурай гэтага часу быў выкладчык Віцебскага мастацкага тэхнікума, скульптар, графік і жывапісец Бразер А., які адным з першых звяртаецца да нацыянальнай гісторыі (бюст Ф. Скарыны).

У другой палове 1920-х г. пачаў свой творчы шлях і З. Азгур, у той час яшчэ студэнт Віцебскага мастацкага тэхнікума. Скульптару належыць цэлы шэраг работ, прысвечаных знакамітым людзям Беларусі: партрэты Ф. Скарыны, А. Пашкевіч, Ф. Багушэвіча, Я. Коласа і інш.

**Заключэнне.** Такім чынам, 1920-я гг. былі вельмі прадукцыйнымі для развіцця выяўленчага мастацтва, станаўленне якога ішло ў вострай барацьбе розных накірункаў і школ. У гэты час майстры старэйшага пакалення працягваюць тварыць у манеры позніх перадвіжнікаў, маладыя мастакі, у сваю чаргу, негатыўна адносіліся да рэалістычных традыцый мінулага, спрабуючы знайсці свае стылі і накірункі ў мастацтве. Спектр выяўленчага мастацтва 1920-х гг. быў даволі шырокі – ад экспрэсіянізму і супрэматызму да артадаксальнага рэалізму.

Не такімі значнымі былі набыткі скульптараў, кадры якіх яшчэ толькі пачыналі рыхтавацца.

Спрыяльныя ўмовы для развіцця нацыянальнага мастацтва фактычна існавалі ўсяго тры гады – з 1927 па 1930. Але шмат з таго, што было зроблена за гэты час, можна на поўнай падставе аднесці да нашай мастацкай класікі. Былі ўсе прычыны лічыць, што Беларусь знаходзіцца напярэдадні культурнага ўздыму.

**Літаратура**

1. НАРБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 521.

2. Шчакаціхін М., Ластоўскі В. Сучаснае беларускае мастацтва. Мінск: Беларускі Дзяржаўны музей, 1929. 53 с.

3. Каспяровіч М. Беларуская культура // Маладняк. 1928. № 12. С. 138–146.

4. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мінск: ВП «Экаперспектыва», 1997. 486 с.

5. НАРБ. Ф. 42. Воп. 1. Спр. 300.

## References


1. NARB. Fund 42. I. 1. F. 521.

2. Shachkatsikhin M., Lastouski V. *Suchasnaye belaruskaye mastatstva* [Contemporary belarusian art]. Minsk, Belaruski Dzyarzhauny muzey Publ., 1929. 53 p.

3. Kaspyarovich M. Belarusian cultura. *Maladnyak* [Youth. Number], 1928, no. 12, pp. 138–146.

4. Lych L., Navitski U. G*istoryya kul'tury Belarusi* [History cultury of Belarus]. Minsk, VP Eka-perspektyva Publ., 1997. 486 p.

5. NARB. Fund 42. I. 1. F. 300.


## Інфармацыя пра аўтара


**Каляда Іна Уладзіміраўна** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: koleda@belstu.by


## Information about the author


**Kalyada Ina Uladzimirauna** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: koleda@belstu.by


*Пастыпіў 04.03.2020*